2. Дзермант, А. Этнагенез беларусаў: навука і ідэалогія / А. Дзермант, С. Санько // ARCHE, 2005. – № 5. – с. 233–253.

3. Кравцевич, А. Белорусы: нация Пограничья / А. Кравцевич, А. Смоленчук, С. Токть. – Вильнюс : Европейский гуманитарный университет, 2011. – 212 с.

4. Марзалюк, І. Ад этнасу да нацыі / І. Марзалюк // Гістарычны альманах. – Т. 7. – Гродна, 2002. – с. 145–174.

5. Крэнь, І. П. С. Этнагенез беларусаў, ці Этнічныя працэсы на беларускіх землях у XIII–XVI ст. / С. Марозава // Гісторыя Беларусі : у 2 ч. – Ч. 1. : Са старажытных часоў да канца XVIII ст. : Курс лекцый / І. П. Крэнь [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – с. 302–330.

6. Мікуліч, А. Этнічная гісторыя беларусаў паводле антрапалагічных дадзеных / А. Мікуліч // Беларускі гістарычны часопіс. – № 2. – 1999. – с. 7–11.

7. Пилипенко, М. Возникновение Белоруссии: Новая концепция / М. Пилипенко. – Минск, 1991. – 143 с.

8. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя / Г. Сагановіч. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.

9. Філіповіч, Я. Маё бачанне этнагенезу беларусаў / Я. Філіповіч // Беларусіка – Albaruthenica. – Кн. 22. : Нацыянальныя пытанні: Матэрыялы III Міжнароднага Кангрэса беларусістаў “Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый” (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.) ; рэдкал. : Э. Дубянецкі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. – с. 22–29.

10. Штыхаў, Г. Вытокі беларускага этнасу / Г. Штыхаў // Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 1. : Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. ; рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2007. – с. 323–330.

***Мішына В.І.***
(*Рэспубліка Беларусь, г. Наваполацк*)

# СІМВАЛІЧНЫ СТАТУС СІРАТЫ Ў КАЗКАВАЙ ПРОЗЕ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ І СУМЕЖНЫХ РЭГІЁНАЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ КАЗАК ТЫПУ “МАЧАХА І ПАДЧАРКА”)

*Праца выканана ў межах праекта № Г20Р-095 "«Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX – начала XXI века»*

Казкі з сюжэтам тыпу “Мачаха і падчарка” (№ 480 паводле “Параўнальнага ўказальніка сюжэтаў” 1979 год) з’яўляюцца аднымі з самых распаўсюджаных на ўсходнеславянскай прасторы [6, с. 16]. Значная колькасць іх зафіксавана збіральнікамі XIX – пачатку XXI стагоддзяў і на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, і сумежных рэгіёнаў, у прыватнасці, Віцебска-Пскоўскага памежжа. Агульны змест сюжэту добра вядомы: па ініцыятыве мачахі нелюбімую падчарку адвозяць у лес, дзе яна сустракае пэўных персанажаў і паспяхова праходзіць ініцыянаваныя імі выпрабаванні, за што атрымлівае ўзнагароду; родная дачка таксама імкнецца атрымаць падарункі, але выпрабаванняў не праходзіць і, як правіла, гіне.

Паводле меркавання Я. М. Меляцінскага, гістарычнай асновай

разгортвання казачнай канфліктнай сітуацыі паміж мачахай і падчаркай служаць трансфармацыйныя працэсы ў сферы сямейна-роднасных сувязей, а менавіта распад роду і вылучэнне малой сям’і, і абумоўлена гэтая сітуацыя тым, што мачаха “не можа замяніць падчарцы маці, таму што яна – прадстаўніца чужога роду”, а адсутнасць “роднасных адносін паміж мачахай і падчаркай – крыніца барацьбы паміж імі” [2, с. 158].

У дадзенай працы ажыццёўлена спроба разгледзець дадзены сюжэт у плоскасці традыцыйных міфапаэтычных уяўленняў, у сістэме якіх адну з важнейшых роляў адыгрывала паняцце “нормы”. З гэтага пункту погляду статус сіраты (то бок дзіцяці, у якога няма ў жывых кагосьці з родных бацькоў) сам па сабе ўжо з’яўляецца адхіленнем ад нормы. Гэта ставіць сірату на адзін узровень з такімі суб’ектамі, як старац, бяздзетная жанчына (або тая, што нарадзіла па-за шлюбам), уласна пазашлюбнае дзіця і да т.п., а менавіта, з людзьмі, у якіх парушаны нармальны ход выбудоўвання сямейна-сваяцкіх сувязей, што надае іх соцыякультурнаму статусу тую ці іншую ступень маргіналізацыі.

Адпаведна, сімвалічны статус сіраты ў межах традыцыйнага светаўспрымання набывае амбівалентны характар. З аднаго боку, пэўная “непаўнавартаснаць” жыццёвага лёсу сіраты (да прыкладу, характарыстыкі сіроцкага вяселля ў абрадавым фальклоры – “невясёлы пір”, “вяселля невясёла”, “парадачку нету”, “няма каму баславіць” [1, с. 134, 149, 165, 168]; або парэміі кшталту “*Сіраце заўсёды вецер у вочы*”, “*Каму месяц свеціць, а ад сіраты хаваецца*” [4, с. 102]), з другога – блізкасць да сферы сакральнага, знаходжанне сіраты пад асаблівай апекай вышэйшых сілаў (адпаведна тэксту тых жа вясельных песень, памерлых бацькоў у абрадзе часта замяняе сам Бог: “*Благаслаўляюць сірату добрыя людзі, / Надзеліць доленькай яе Божанька*”; “*Ай, сядзь, Божухна, на куце, / Ай, дай долечку сіраце*” [1, с. 80], або – у прыказках – “*Сірочыя слёзы дармо не прападаюць*”, “*Над сіратой Бог з калітой*” [4, с. 103, 104].

Такім чынам, галоўная гераіня разглядаемага казкавага сюжэту – сірата – персанаж са спецыфічным статусам і адметнай роляй у сістэме камунікацыі паміж рознымі ўзроўнямі светабудовы. Варта звярнуць увагу на тое, што ў тэкстах разглядаемага тыпу статус сіраты маюць фактычна абедзьве дачкі, так як у дзедавай дачкі няма роднай маці, а ў бабінай, адпаведна – роднага бацькі. Разам з тым, становішча гераінь адрозніваецца, паколькі, адпаведна традыцыйным уяўленням, менавіта адсутнасць маці з’яўляецца найбольш драматычным варыянтам сіроцтва: “*Бацька ўмрэ – то палавіна сіраты, а як маці ўмрэ, то цэла сірата*” [4, с. 84]. Гэта, як можна меркаваць, здольна выклікаць большую спагаду ў звышнатуральных сілаў (да прыкладу, ў адным з разглядаемых тэкстаў падчарка (дзедава дачка) ў лесе просіць Мароза: “*не марозь мяне, я бедная сіротка, у мяне мамкі няма, жалець няма каму*”, а бабіна дачка дзёрзка заяўляе яму: “*Не баюся я цябе, у мяне мамка ёсць!*” [7, с. 229, 230]

Уразлівасць статусу сіраты-падчаркі падкрэсліваецца яшчэ і тым, што завязкай сюжэту служаць менавіта кепскія адносіны мачахі да дзедавай дачкі: "*Ну, абрыдзела мачасе ўжо дзедава дачка. Тады што яна, мачаха, сказала: – «Звязі ты гэту сваю дачку, дзед, каб яна не была. Так ужо яна мне надаела»*" [7, с. 232–233]; "Мачеха не любила не свою дочь. И всё думала: как бы нам её сжить?" [5, с. 97]

Такім чынам, матыў адвозу дачок у лес адрозніваецца (дзедаву адвозяць, каб зжыць са свету, бабіну – каб атрымаць падарункі), але да пэўнага моманту сітуацыя ў абодвух выпадках разгортваецца аднолькава: гераіня патрапляе ў локус, што ў той ці іншай ступені асацыюецца са сферай "чужога" (лес, хатку на курынай ножцы, лазню), дзе адбываецца камунікацыя з прадстаўнікамі "нечалавечага" свету (Марозам, мядзведзем (ваўком), чарцямі і да т. п.). Тут яна мусіць прайсці пэўныя выпрабаванні, ініцыяваныя названымі персанажамі. Пры гэтым, у сюжэтах, дзе фігуруе сустрэча з мядзведзем у хацты на курынай ножцы, выпрабаванні носяць характар імператыву: "*перастаў мне ножкі!... звары мне есці!... пасцялі пасцель!*" [7, с. 234], у той час як у варыянтах з Марозам ад гераіні патрабуецца хутчэй дэманстрацыя ўзроўню валодання маральна-этычнымі нормамі.

Як сведчаць тэксты казак, паводзіны гераінь у падобных абставінах адрозніваюцца дыяметральна процілеглым чынам. Як правіла, дзедава дачка пры сустрэчы з Марозам дэманструе ветлівасць, пакорлівасць, расказвае пра сваю няшчасную долю, а бабіна, наадварот, паводзіць сябе фанабэрыста, груба. У дадзеным варыянце сюжэта менавіта такіх паводзін дастаткова, каб адпаведным чынам узнагародзіць дзедаву дачку і пакараць бабіну, у той час як у тэкстах з мядзведзем ад гераіні патрабуецца выкананне пэўных дзеянняў. Загады мядзведзя іншы раз выглядаюць ірацыянальнымі, аднак дзедава дачка выконвае іх беспярэчна, у той час як бабіна адмаўляецца гэта рабіць у дастаткова абразлівай форме: "*Невялікі пан, можаш і сам!*" [7, с. 237]. У варыянтах гэтага тыпу фігуруе яшчэ і мышка – персанаж-памочнік, адносіны гераіні да якога іграюць ключавую ролю ў далейшым разгортванні падзей. Дзедава дачка праяўляе ўменне суперажываць і прыходзіць на дапамогу (корміць мышку кашай і выратоўвае яе), а бабіна дзейнічае цалкам процілеглым чынам. Вынікам падобных дзеянняў становіцца ўзнагарода дзедавай дачкі і вяртанне яе дадому: "*Ты мне служыла добра – я цябе адпускаю!*" [7, с. 235] і гібель бабінай дачкі (мядзведзь яе з'ядае).

Падарункі, што атрымлівае дзедава дачка, у розных тэкстах носяць варыятыўны характар, ад абстрактнага "багацця" да канкрэтнага пераліку рэчаў і дабротаў: "*куфар адзежы і чаравікі, пара коней і павозка такая ўбраная*"; "*і каня ж…, і карэту…, сукенкі і там багацтва ўсялякага цэлы сундук*" [7, с. 229, 235]; "*даў багацця і тройку коней ей даў*" [3, с. 19]. Апроча таго, у фінале казкі дзедава дачка часцей за ўсё ўступае ў шлюб, гэта таксама можа быць разгледжана як

частка ўзнагароды. У выніку спробы мачахі пазбавіць падчарку жыцця абарочваюцца, так бы мовіць, "кампенсацыяй" за перанесеныя апошняй нягоды, вяртаннем жыццёвага сцэнару падчаркі да адноснай нормы (атрыманне "долі", уступленне ў шлюб). Аднак важнай умовай атрымання гэтай "кампенсацыі" з'яўляецца захаванне пэўнай лініі паводзін, якая ў цэлым адпавядае агульнай нарматыўна-каштоўнаснай сістэме традыцыйнай супольнасці. Верагодна, ірацыянальны характар некаторых патрабаванняў (пераставіць мядзведзю ножкі, сцяліць пасцель "з камення і палення") можа сведчыць аб тым, што першапачатковы змест тэксту ўказваў на іншы (рытуальна-магічны) змест выпрабаванняў, якія, аднак, з цягам часу набылі ў большай ступені менавіта маральна-этычную афарбоўку.

У святле сказанага цікавымі падаюцца асобныя варыянты сюжэту, зафіксаваныя ў разглядаемым рэгіёне. Так, у тэксце "Казка пра двух дзяўчынак і мядзведзя" ўказваецца, што адна з дзвюх сясцёр была няроднай як для дзеда, так і для бабы, то бок яе сіроцкі статус выяўлены максімальным чынам [5, с. 99], і менавіта гэтая гераіня становіцца любімай для прыёмных бацькоў. Сюжэт гэтай казкі развіваецца па іншым сцэнарыі: гераіні збягаюць ад мядзведзя, парушыўшы забарону зазіраць у месца, дзе знаходзіцца багацце ("*дзе лыкам завязана і глінай замазана*") [5, с. 100], і забраўшы частку гэтага багацця сабе. Выпрабаванні тут заключаюцца не толькі ў прыслугоўванні мядзведзю, але і ў дапамозе сустрэчным персанажам (коней трэба распутаць і напаіць, авечак абстрыгчы, кароў падаіць, дуб трэба абмесці). Адпаведна, няродная дачка выконвае ўсе просьбы і застаецца жывой: "*З дубу ина вылязла. Нихто ие не продаў: ина вси обязанности выполнила*" [5, с. 101]; а родная ўсе просьбы ігнаруе і ў выніку гіне.

Таксама ўяўляюць цікавасцю сюжэты, дзе гераіні адпраўляюцца не ў лес, а ў лазню (локус з перыферыйнай сімволікай). У казцы "Мачаха, дачка і падчарка", запісанай на Пскоўшчыне, мачаха адпраўляе падчарку ў лазню на цэлую ноч прасці, але тая адразу дэманструе дастатковы ўзровень дасведчанасці і бярэ з сабою пеўніка, што ў выніку іграе рашаючую ролю ў камунікацыі з прадстаўнікамі патойбочнай сферы (чарцямі ў вобразе хлопцаў) і становіцца крыніцай яе ўзнагароды. У размове з чарцямі дзяўчына таксама дэманструе ветлівасць і стрыманасць, у той час як бабіна дачка і пра пеўніка не ведае, і чарцям грубіяніць. У адрозненне ад папярэдніх, дадзены сюжэт не заканчваецца гібеллю бабінай дачкі, аднак узнагароды яна таксама не атрымлівае: дзедава дачка ў прыгожых уборах выходзіць замуж, а бабіна дачка, якую чэрці "*збілі ўсю, страпалі. папэцкалі*", "*з маткай так і засталася ў дзеўках*" [5, с. 98].

Такім чынам, статус сіраты, будучы медыятыўным па сваёй сутнасці па прычыне парушэння сістэмы традыцыйных сямейных сувязей, сам па сабе яшчэ не абумоўлівае спрыяння з боку вышэйшых сілаў. Паводле прааналізаваных казак, узнагароду ад гэтых сілаў (увасобленых у вобразе персанажа-

дарыльшчыка) сірата атрымлівае толькі ў выпадку паспяховага пераадолення ініцыяцыйных выпрабаванняў.

**Літаратура**

1. Вяселле: Песні. У 6 кн. / рэд. М. Я. Грынблат, А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980–1988. – Кн. 3 / склад. Л. А. Малаш ; муз. дад. З. Я. Мажэйка. – 1983. – 768 с.
2. Мелетинский, Е. М. Герой волшебной сказки. Происхождение образа / Е. М. Мелетинский. – М. ; СПб. : Академия Исследований Культуры; Традиция, 2005. – 240 с.
3. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2. : Народная проза беларусаў Падзвіння : У 2 ч. / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – 292 с.
4. Прыказкі і прымаўкі : У 2 кн. / АН БССР, Ін-т мастазцтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 2. – 616 с.
5. Сказки Псковской области / под ред. Г. И. Площук. – Псков : ПГПИ, 2004. – 620 с.
6. Сравнительный указатель сюжетов : Восточнославянская сказка / отв. ред. К. В. Чистов. – Л. : Наука, 1979. – 437 с.
7. Чарадзейныя казкі. У 2 ч. / НАН Беларусі, Ін-т мастазцтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; склад. К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч ; рэд. В. К. Бандарчык. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск : Бел.навука, 2003. – Ч. 2 – 691 с.

***Назарчук В.И.***
(*Российская Федерация, г.Красноярск*)

## ПОПУЛЯРИЗАЦИЯ ДЕТСКОГО ФОЛЬКЛОРА ВО ВНЕУРОЧНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ КАК ФАКТОР ЕГО СОХРАНЕНИЯ В СОВРЕМЕННЫХ УСЛОВИЯХ

Проблематика функционирования детского фольклора в современных условиях в России является особо актуальной. Подтверждением этого есть снижение интереса младших школьников к детскому фольклору. Такая ситуация наблюдается не только в урбанизированной среде, но и в сельской, где сохранились некоторые пласты традиционной культуры (обычаи, праздники, обряды, песенный и игровой фольклор), в частности – в сельских районах Красноярского края.

Исследователи (этнографы, фольклористы, культурологи, педагоги) причиной такой ситуации считают процессы глобализции и формирование информационного пространства, которые влияют на изменения традиционного быта и уклада жизни населения, а он, по мнению Б. Путилова, является «одним из главных условий функционирования фольклора и поддержки живых фольклорных традиций» [5, с. 5].

Поэтому вопросам функционирования детского фольклора в традиционной культуре и современных условиях посвятили научные труды отечественные и зарубежные исследователи: М. Мельников, Г. Барташевич, Г. Довженок